ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 3 (639) | Аўторак, 20 студзеня 1987 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## ЗАДАЧЫ ВЫШЭЙШАЙ І СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ ШКОЛЫ

**З сацыялістычных абавязацельстваў працоўных Гомельшчыны на 1987 год**

На абласным сходзе партыйна-гаспадарчага актыву, які нядаўна адбыўся ў Гомелі, прыняты сацыялістычныя абавязацельствы працоўных Гомельскай вобласці на 1987 год.

**У галіне навукі і навуковага абслугоўвання,** у прыватнасці, прадугледжана:

Павысіць аддачу навуковага патэнцыялу НДІ, ВНУ, эфектыўна выкарыстоўваць яго для вырашэння навукова-тэхнічных праблем і прафесіянальнай падрыхтоўкі спецыялістаў. Забяспечыць на ўзроўні сусветных аналагаў распрацоўку заданняў праграмы «Інтэнсіфікацыя». Стварыць філіялы вузаўскіх кафедраў на прадпрыемствах Гомельскага аддзялення Беларускай чыгункі, вытворчага аб'яднання «Гомсельмаш», у арганізацыях аблспажыўсаюза. Выдаюць народнай гаспадарцы для ўкаранення не менш за 80 навуковых распрацовак.

Рэалізаваць у арганізацыях аблаграпрома тэхналогіі аднаўлення дэталей сельгасмашын, правесці выпрабаванне новых капсуліраваных угнаенняў. Расшырыць выкарыстанне палімерных і кампазіцыйных матэрыялаў. Стварыць генеральную схему лесаразвядзення на асушаных землях, сістэму біялагічнай барацьбы са шкоднікамі лесу.

З улікам патрэбнасцей у кадрах галін народнай гаспадаркі вобласці ўнесці карэктывы ў існуючыя спецыяльнасці ў ВНУ і тэхнікумах. Забяспечыць павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў па найноўшых напрамках развіцця тэхнікі і тэхналогіі ў Гомельскім машынабудаўнічым тэхнікуме і ў навукова-даследчым інстытуце лясной гаспадаркі.

Гонар кожнага вучонага, выкладчыка, навуковага супрацоўніка ГДУ ўнесці дастойны ўклад у выкананне сацыялістычных абавязательстваў працоўных Гомельшчыны, канкрэтнай справай адказаць на паспяховае ажыццяўленне рашэнняў XXVII з'езда КПСС, наступных пленумаў ЦК КПСС па паскарэнню сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

*У ФОТААБ'ЕКТЫВЕ — ЗІМОВАЯ СЕСІЯ*



НА ЗДЫМКУ: да адказу на экзамене па матаналізу рыхтуецца другакурсніца фізічнага факультэта Святлана Чудзілоўская.



Толькі выдатныя адзнакі стаяць у заліковцы студэнткі гр. БР-43 гісторыка-філалагічнага факультэта Алены Савіцкай пасля трох здадзеных экзаменаў — палітэканоміі, педагогіцы і асновах навуковага атэізму.



Вышэйшым балам ацэнены веды другакурсніцы біяфака Таццяны Шаршнёвай на экзамене па арганічнай хіміі, які прымаў дацэнт Ю. А. Праляскоўскі.

Фота А. Ульянкінай.

## МЭТА—ЯКАСЦЬ ВЕДАЎ

...У руках заліковая кніжка, ручка і чысты лісток паперы. А ў галаве ў апошні момант перад уваходам у аўдыторыю, дзе праходзіць экзамен, — ад хвалявання поўная блытаніна. І толькі тады, калі перад студэнтам на стале ляжыць экзаменацыйны білет з пытаннямі, думкі паступова набываюць яснасць, прыходзяць у сістэму. Зразумела, так адбываецца пры ўмове, калі да экзамена студэнт рыхтаваўся сур'ёзна, не спадзяваўся на шчаслівы выпадак. Тады і вынік заканамерны — выкладчык ставіць у экзаменацыйную ведамасць добрую або выдатную адзнаку.

Гэта адзін са шматлікіх эпізодаў гарачай студэнцкай пары, імя якой — сесія. А колькі іх — і «трагічных», і смешных — здараецца яшчэ ў гэтую пару! Каб было як мага менш у сесію сумных вынікаў, патрэбны агульная заклапочанасць усіх: саміх студэнтаў, выкладчыкаў, дэканатаў.

Менавіта такі падыход да справы характэрны для калектыву матэматычнага факультэта. Яшчэ напярэдадні зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі тут праводзіліся сумесныя пасяджэнні дэканата і партбюро, на якіх абмяркоўвалася адно пытанне: што трэба зрабіць, каб студэнты паспяхова вытрымалі выпрабаванне на веды, дзе ёсць слабыя звенні, на якія трэба звярнуць асаблівую ўвагу? Зразумела, што найбольшае хваляванне выклікалі першакурснікі. Як вытрымаюць яны сваё першае «баявое хрышчэнне», на што яны здольны? Калі адказы на гэтыя пытанні мог даць толькі час, то з магчымасцямі астатніх курсаў кіраўніцтва матфака было ўжо знаёма з папярэдніх сесій. Таму прымаліся канкрэтныя меры па арганізацыі дадатковых кансультацый па найбольш складаных дысцыплінах для слабых студэнтаў, замежных навучэнцаў. Былі заслуханы таксама тыя выкладчыкі, у якіх шмат студэнтаў не здалі залікі і, натуральна, не былі дапушчаны да экзаменаў. Высвятляліся прычыны такога становішча. Вялікая роля адводзілася на факультэце ў гэты час і студэнцкаму самакіраванню. Члены вучэбна-выхаваўчай камісіі разам са старастамі груп правялі пасяджэнні, на якіх вызначылі, каму са студэнтаў патрабуецца дапамога ў падрыхтоўцы да экзаменаў, замацавалі за імі выдатнікаў.

Якія ж вынікі дала мэтанакіраваная падрыхтоўчая работа да сесіі на матфаку? Гэтае пытанне было зададзена намесніку дэкана факультэта М. В. Селькіну.

— Станоўчыя, — тлумачыць Міхаіл Васільевіч. — Мяркуйце самі: з усіх груп другога курса пасля першага здадзенага экзамена па матаналізу выстаўлены толькі тры нездавальняючыя адзнакі. Нядрэнныя вынікі пакуль і ў чацвёртакурснікаў, хаця, шчыра кажучы, яны выклікалі ў нас заклапочанасць. Пасля двух здадзеных экзаменаў толькі некаторыя «праваліліся».

Калі параўноўваць усё гэта з вынікамі папярэдніх сесій, то можна сказаць, што зрухі ў лепшы бок адчувальныя. Тлумачыцца гэта не толькі папярэдняй падрыхтоўчай работай нашага калектыву да сесіі, але ў значнай ступені тым, што да нас цяпер паступае моладзь больш падрыхтаваная. Гэта пацвердзіў сёлетні першы курс. Возьмем, напрыклад, групу М-14. Па стану на 15 студзеня з 24 чалавек 14 атрымалі толькі выдатныя адзнакі на экзаменах па аналітычнай геаметрыі і алгебры. А тых першакурснікаў, якія «праваліліся» на першых выпрабаваннях (іх адзінкі), мы возьмем на кантроль, таксама як і студэнтаў старэйшых курсаў, якія паказваюць слабыя веды.

Канчатковыя вынікі будуць падведзены пасля сесіі. А пакуль што можна сказаць: наш калектыў імкнецца рабіць усё дзеля адной мэты — рыхтаваць маладых спецыялістаў з трывалым багажом ведаў. Цяпер асноўная ўвага павінна ўдзяляцца якасці падрыхтоўкі, а не колькасці выпускнікоў ВНУ. Зыходзячы з гэтага, мы і будуем нашу работу.

Т. НІКАЛАЕВА.

## ВЫНІКІ—ДОБРЫЯ

Мала нездавальняючых адзнак у заліковках і ведамасцях, нязначная колькасць студэнтаў, недапушчаных да экзаменаў, — такі агульны малюнак становішча спраў у гэтыя дні на фізічным факультэце. У дэканаце карэспандэнту газеты паведамілі таксама аб тым, што асабліва добра справы ідуць у першакурснікаў. Двоек тут па стану на 15 студзеня не было наогул. А прыклад добрасумленных адносін да вучобы паказваюць ленінская стыпендыятка трэцякурсніца Алена Пасько, студэнт 3-га курса Валерый Зялёны і інш.

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат гісторыка-філалагічнага факультэта, кафедра рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры ЦІМАШЭНКА Алену Іванаўну з зацвярджэннем яе ВАКам у вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

*Умацаванне міру—справа ўсіх і кожнага*

# ЗА ЧЫСТАЕ НЕБА

У Гомелі стала добрай традыцыяй, што ў пачатку года ветэраны партыі, Вялікай Айчыннай вайны і працы, знатныя людзі горада звяртаюцца да ўсіх працоўных калектываў і гамяльчан з заклікам праводзіць працоўныя вахты міру ў гонар знамянальных дат і падзей у жыцці нашага народа. І заўсёды гэтая ініцыятыва знаходзіць шырокую падтрымку.

Толькі ў мінулым годзе гамяльчане ўнеслі ў скарбонку міру 1 мільён 96 тысяч рублёў, што дазволіла гораду заняць першае месца сярод абласных цэнтраў рэспублікі.

Вось і гэтымі днямі ў гаркоме партыі сабраліся знатныя людзі горада: Героі Савецкага Саюза, Героі Сацыялістычнай Працы, перадавікі і наватары вытворчасці. Яны прынялі зварот да ўсіх працоўных калектываў і жыхароў горада.

**НА ЗДЫМКУ: у час падпісання звароту (ніжні рад злева направа) заслужаны дзеяч навукі БССР, рэктар ГДУ В. В. ВОКУЦЬ, ветэран партыі С. М. ЛЕБЕДЗЕЎ, генерал-маёр у адстаўцы, заслужаны лётчык СССР В. С. ШУКШЫН, ветэран партыі, старшы інжынер радыёзавода А. С. ФРАМЕШКІН, генерал-маёр у адстаўцы Р. Д. МУХІН; (другі рад злева направа) поўны кавалер ордэна Працоўнай Славы, брыгадзір вадзіцеляў аўтакамбіната № 1 В. І. ГАРНАК, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Д. І. АЛЕЙНІК, Герой Савецкага Саюза У. В. ГАМЗІН, Герой Сацыялістычнай Працы Р. С. ЦАКУНОВА, Герой Савецкага Саюза В. П. КАЛАЧ, Герой Савецкага Саюза Р. К. ДЗЕНІСЕНКА, Герой Сацыялістычнай Працы, каваль аб'яднання «Гомсельмаш» В. М. ХУРСАН, поўны кавалер ордэна Славы М. А. ЛЕБЕДЗЕЎ.**

Фота М. Высоцкага.



# З В А Р О Т

## ветэранаў партыі, вайны і працы, актывістаў Савецкага Фонду міру да ўсіх працоўных калектываў і жыхароў горада Гомеля

Дарагія таварышы! Мы, ветэраны партыі, Вялікай Айчыннай вайны і працы, Узброеных Сіл СССР, актывісты Савецкага Фонду міру, звяртаемся да ўсіх камуністаў і камсамольцаў, рабочых і служачых, пенсіянераў і моладзі горада з заклікам у год 70-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі прыняць актыўны ўдзел у барацьбе за мір, прадухіленне ядзернай катастрофы.

Мы ганарымся тым, што адным з першых дэкрэтаў Савецкай улады быў Ленінскі дэкрэт аб міры. Вось ужо амаль 70 гадоў наш народ з вялікай мужнасцю і годнасцю адстойвае і абараняе мір. Але мы ведаем і тое, як нялёгка ў нашы дні дасягнуць гэтага. Мы аднадушна адабраем і горача падтрымліваем міралюбівую знешнюю палітыку КПСС і Савецкай дзяржавы, якія робяць усё магчымае, каб над намі было мірнае неба. Наш ідэал —свет без зброі і насілля, свет, у якім кожны народ свабодна выбірае шлях развіцця, свой лад жыцця.

Міру ў імперыялістаў не выпрасіш, гэта зразумела. За мір трэба змагацца ўсім і кожны дзень. Адных слоў у падтрымку міру мала. Патрэбны нашы канкрэтныя справы. Адказам павінна паслужыць якасная і высокапрадукцыйная праца кожнага чалавека на сваім рабочым месцы, актыўны ўдзел у дзейнасці Савецкага Фонду міру.

Барацьба за мір — справа ўсіх і кожнага. Мы звяртаемся да ўсіх ветэранаў партыі, вайны і працы, Узброеных Сіл СССР з заклікам яшчэ больш настойліва весці работу па патрыятычнаму і інтэрнацыянальнаму выхаванню працоўных і моладзі горада ў духу бязмежнай любві і адданасці нашай Радзіме, актыўнай барацьбы за захаванне міру на Зямлі. Мы заклікаем юнакоў і дзяўчат нястомна авалодваць ведамі, культурай, прафесіянальным майстэрствам, памнажаць слаўныя рэвалюцыйныя, працоўныя традыцыі нашай партыі і народа. Горача падтрымліваем ініцыятыву камсамольска-маладзёжных калектываў аб залічэнні ў свае рады Герояў Савецкага Саюза — гамяльчан і пералічэнне заработнай платы ў Фонд міру.

**Мы заклікаем** ўсіх працоўных горада **яшчэ больш настойліва** весці барацьбу за ажыццяўленне рашэнняў XXVII з'езда КПСС, больш актыўна вырашаць задачы паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і горада. Няхай высокая якасць працы, больш строгая эканомія, моцная дысцыпліна — стануць залогам хутчэйшага руху наперад, залогам нашай абароннай магутнасці.

Мы звяртаемся да ўсіх працоўных калектываў і жыхароў горада з заклікам ў юбілейным годзе правесці працоўныя вахты міру пад дэвізам: «Дзень ударнай працы — Фонду міру». Гэтыя вахты міру гамяльчане прысвецяць гадавінам Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту, Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, вызвалення Беларусі і г. Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 70-годдзю Вялікага Кастрычніка і Ленінскага дэкрэта аб міры. Дадаткова выпушчаная ў гэтыя дні прадукцыя будзе важкім укладам у эканамічную і абаронную магутнасць нашай любімай Радзімы.

Мы спадзяемся, што гэтая ініцыятыва знойдзе шырокую падтрымку сярод усіх працоўных нашага ардэнаноснага Гомеля. Няхай кожны гамяльчанін унясе свой уклад ва ўсенародную скарбонку Савецкага Фонду міру. Азнамянуем год 70-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі актыўнай прапагандысцкай растлумачальнай работай па прапагандзе мірных ініцыятыў роднай партыі і Савецкага ўрада!

Няхай 1987 год стане годам актыўнага ўдзелу кожнага гамяльчаніна ў барацьбе за мір, за раззбраенне!

**Зварот прыняты ветэранамі партыі, вайны і працы — актывістамі Савецкага Фонду міру 9 студзеня 1987 года.**

*НА ШЛЯХУ ПЕРАБУДОВЫ*

# ВЫПРАЦОЎВАЕЦЦА САМАСТОЙНАСЦЬ

**На эканамічным факультэце ва ўсіх групах чацвёртага курса спецыяльнасці «Эканоміка працы» праведзена дзелавая гульня «Брыгадныя формы арганізацыі і стымулявання працы».**

Дзелавая гульня падводзіць вынікі па ўсіх чытаемых курсах кафедры эканомікі працы і заснавана на самастойнай рабоце студэнтаў з матэрыяламі канкрэтнага пярвічнага калектыву рэальнага прадпрыемства. Гульня дае магчымасць кожнаму студэнту прымяніць атрыманыя веды ў галіне арганізацыі, нарміравання і эканомікі працы пры аргпраектаванні брыгады пад кантролем выкладчыка. Яна накіравана на актывізацыю пазнавальнай дзейнасці студэнтаў, стварэнне стымулюючых умоў для паглыблення прафесіянальных ведаў і развіцця творчых здольнасцей. Вучэбны матэрыял у працэсе гульні засвойваецца студэнтамі ў значнай меры самастойна, шляхам аналізу і ацэнкі рэальнай сітуацыі, метадам спроб і памылак. Канчатковы варыянт рашэння чацвёртакурснікі прымаюць пасля «мазгавога штурму» удзельнікаў умоўных структурных падраздзяленняў прадпрыемства. Працягласць дзелавой гульні — 7 акадэмічных гадзін.

Выкладчыкі, якія прысутнічаюць на гульні, уключаюцца ў гульнявыя групы і даюць неабходныя кансультацыі. Пры гэтым здзіўляе раскаванасць адносін студэнтаў з педагогамі. Адсутнічае боязь за няправільны погляд на прадмет даследавання, выкладчыкі карэкціруюць веды без «націску» на свой аўтарытэт. Групы працуюць як калектывы з добрым псіхалагічным кліматам. Ранжыраванне па ролях ідзе хутка, кожны заняты сваёй праблемай, шукае адказ у «інфармацыйных папках», «бібліятэцы», якія рыхтуюць для студэнтаў лабаранты кафедры. Кансультацыю ў любога выкладчыка можна атрымаць за межамі вучэбнага класа. Гульня вучыць сумеснымі намаганнямі дабівацца лепшых вынікаў, прывівае здольнасці працаваць у калектыве, улічваючы інтарэсы кожнай функцыянальнай групы і асобнага ўдзельніка гульні.

Размеркаванне роляў адбываецца за 10—12 дзён да дзелавой гульні, і кожны яе ўдзельнік ужо гатовы вырашаць пытанні ў межах сваіх абавязкаў. «Штаб гульні» ажыццяўляе кантроль за падрыхтоўкай да яе групы. На гульню група прыходзіць з «нагляднай агітацыяй» па прапанаванай тэме (выказваннямі вядомых людзей па прадмету, шаржамі, карыкатурамі, заклікамі і г. д.).

Спачатку студэнты вывучаюць інфармацыю, атрыманую ад выкладчыка, рыхтуюцца да «вытворчага сходу». На ім выступае кожны ўдзельнік гульні, вядуцца пратаколы сходу. Пры гэтым адсутнічае скаванасць пры выкладанні сваіх думак.

Здзіўляе высокі творчы ўздым групы ў час гульні, уменне правільна размеркаваць службовыя ролі, уключыцца ў работу, да канца гульні выдаць справаздачу аб брыгаднай арганізацыі працы з мерапрыемствамі.

Высокі ўзровень самападрыхтоўкі і арганізаванасці праявіла група Т-43 (староста А. Чарняўская), студэнты А. Лішык, А. Унукоўская, Т. Балабаева, Т. Сучкова, В. Лепшы, Э. Гаўрылава і інш.

Дзелавая гульня праведзена таксама ў адной групе слухачоў факультэта цыклавой падрыхтоўкі. Тут гульня мела яшчэ большы эфект, таму што многія яе ўдзельнікі змаглі атрымаць кансультацыі па пытаннях, якія яны вырашаюць у межах абавязкаў сваіх пасад на прадпрыемствах. У прыватнасці, імі былі атрыманы метадычныя рэкамендацыі кафедры эканомікі працы па пытаннях развіцця брыгаднага гаспадарчага разліку, размеркавання брыгаднага заработку па каэфіцыенту працоўнага ўдзелу, дакументацыі па ўліку брыгад і брыгадзіраў. Слухачы факультэта цыклавой падрыхтоўкі высока ацанілі дзелавую гульню, якая дае магчымасць праверыць правільнасць выбранага рашэння, суаднесці яго з аналагамі ў практыцы прадпрыемстваў.

На наш погляд, дзелавая гульня як адзін з відаў актывізацыі пазнання дае найбольшы эфект, таму што «мазгавы штурм» па актуальнай праблеме застаецца ў памяці на ўсё жыццё як працоўны дзень спецыяліста, арганізаваны на аснове навуковай арганізацыі працы. Таму дзелавыя гульні павінны замяніць частку практычных заняткаў з мэтай комплекснага пазнання праблемных пытанняў па кожнаму курсу.

**Э. ЛІЗАРАВА,**
**старшы навуковы супрацоўнік кафедры эканомікі працы;**
**Т. ІВАНОВА,**
**асістэнт кафедры.**



**У бібліятэцы ГДУ працуе нямала людзей, аб якіх можна гаварыць шмат добрых і цёплых слоў. Ірына Аляксандраўна Масквічова, старшы бібліёграф, загадчыца чытальнай залы № 2, адна з іх. Звыш 10 гадоў працуе яна ва універсітэце.**

**Шмат клопатаў цяпер у работнікаў бібліятэкі: ідзе экзаменацыйная сесія і павялічыўся аб'ём літаратуры, якая выдаецца студэнтам. Наш фотакарэспандэнт А. Ульянкіна зрабіла гэты здымак у чытальнай зале № 2. І. А. Масквічова — за выдачай кніг.**

